

НОВАБУДОЎЛІ ВЫХОДЗЯЦЬ НАПЕРАД 5

ШТО ПРАПАНУЕ НАМ МОДА? 13





Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

13 ЛІСТАПАДА 2018 г. АЎТОРАК № 218 (28834)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Максім ЕРМАЛОВІЧ, міністр фінансаў:**

*«Перагаворы аб прапрацоўцы пытання памеру кампенсацый для беларускай эканомікі з-за падатковага манеўру ў нафтавай галіне Расійскай Федэрацыі вядуцца з прыцягненнем усіх зацікаўленых. Эксперты працуюць паміж сабой, шмат тэхнічных пытанняў трэба ўрэгуляваць. Прынцыповыя ёсць пытанні. Усё трэба абмяркоўваць. Высвятляем пазіцыю сваіх расійскіх калег, разумеем, якія там ёсць асаблівасці ў гэтым працэсе. Што датычыцца тэрмінаў, у якія Беларусь і Расія дамовяцца па механізме кампенсацыі, то гэта цяжкае пытанне».*

# Мужчынскае выхаванне



Фота БелТА.

Юрый ЛІТОШЫК, выпускнік Полацкага дзяржуніверсітэта, працуе выхавальнікам у віцебскіх яслях-садзе № 52. Яго маленькім падапечным па тры-чатыры гадкі — самы цікаўны і няўрымслівы ўзрост. Але малады выхавальнік лёгка знаходзіць з імі агульную мову.

## КОРАТКА

• **Беларусь у студзені — верасні 2018 года павялічыла экспарт тавараў і паслуг у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года на 18 % — да $31,06 млрд.**

• Упершыню грамадзянка Беларусі стала кавалерам ордэна Імператара Японіі. Узнагароды ўдастоена народная артыстка Беларусі, выкладчык Беларускай дзяржаўнай харэаграфічнай гімназіі-каледжа Клара Малышава.



• **Нацыянальны аэрапорт Мінск укараняе сістэму самастойнай здачы багажу пасажырамі.**

• Мінск прымае міжнародны форум па барацьбе з адмываннем злачынных даходаў.

Навука для жыцця

# ЭЛЕКТРЫЧНАЯ ЦЯГА Ў БУДУЧЫНЮ

### Ужо праз тры гады ў краіне павінна быць больш за 400 ЭЗС



**Адна з самых актуальных задач, якія сёння стаяць перад навукова-прамысловым комплексам Беларусі, — распрацоўка і серыйны выпуск разнастайных відаў сучасных транспартных сродкаў на электрычнай цязе. А таксама стварэнне інфраструктуры для іх паспяховай эксплуатацыі. Зразумела, такія амбіцыйныя планы з'явіліся не на пустым месцы. Немагчыма не заўважыць, куды дзьме вецер на гіганцкай прасторы сусветнага аўтапрама. Электробусы і аўтамабілі на акумулятарных батарэях актыўна перабіраюцца з разраду экзотыкі ў катэгорыю банальнай штодзённасці. Пакуль іх не так шмат, але няма сумненняў, што ў хуткім часе яны выцесняць традыцыйных жалезных коней з іх атрутнымі выхлапамі. Наша краіна прымае меры, каб не апынуцца ў хвасце тэхнічнай рэвалюцыі. Па даручэнні Прэзідэнта Нацыянальная акадэмія навук распрацавала «Праграму развіцця электратранспарту на 2018—2022 гады». Дык якія ж перспектывы чакаюць гэты сектар беларускай эканомікі ў найбліжэйшай будучыні? Аб гэтым размова з генеральным дырэктарам Аб'яднанага інстытута машынабудавання НАН Сяргеем ПАДДУБКАМ.**

СТАР. 4

Побач з намі

# СЯБРОЎСТВА НЕ МАЕ ПАРОДЫ

### Сацрэклама, якой нам не хапае

**«Не кідай мяне на лецішчы», «Я таксама хачу сустрэць Новы год дома» — такія кранальныя словы бачылі жыхары Масквы на білбордах з сацыяльнай рэкламай пра бяздомных жывёл. Падобныя акцыі праходзяць там пастаянна на працягу многіх гадоў, бо пытанне з вулічнымі катамі і сабакамі застаецца адкрытым і патрабуе дапамогі грамадскасці. У нас сітуацыя з бяздомнымі жывёламі не лепшая, але такой сацыяльнай рэкламы вы ў сталіцы, на жаль, не ўбачыце. Падобны праект з'явіўся сёлета ў Кобрыне. Ён прыцягнуў увагу як жыхароў горада, так і зоаабаронцаў з усёй краіны. Гэта не першы праект у гэтым горадзе, накіраваны на дапамогу, як той казаў, братам нашым меншым.**

СТАР. 13




ISSN 1990 - 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СЯБРОЎ У НОВЫМ ГОДЗЕ НЕ МЯНЯЮЦЬ!

Ідзе падпіска на «Звязду» на І квартал і І паўгоддзе 2019 года.

Заставайцеся з намі — будзе цікава!